**«ЖЫЦІЁ АЛЯКСЕ́Я, ЧАЛАВЕ́КА БО́ЖАГА»**, перакладны агіяграфічны твор старажытнабеларускай л-ры. Першапачаткова тэкст набыў папулярнасць у Зах. Еўропе. Прыблізна ў 10 ст. трапіў у Візантыю, дзе аформіўся як тыповы царк. жыццяпіс. На тэр. Беларусі вядома ўжо з 11 ст., на старабел. мову перакладзена ў 15 ст. За аснову ўзятыя лацінскі варыянт «Legenda Aurea Jacobi de Voragine», а таксама чэшскія рукапісныя крыніцы. Бел. рэгіянальны варыянт захаваўся ў копіях 15—17 ст. У аснове сюжэта твора ляжыць гісторыя юнака з сям'і «прешляхетного римлянина Евфимияна». Пакліканы верай у Бога, у імя духоўнага ўдасканалення Аляксей адмаўляецца ад сям'і, жонкі, багацця і накіроўваецца ў Сірыю, дзе жыве як пустэльнік. Вярнуўшыся ў Рым, Аляксей 17 гадоў жыў пад сходамі свайго дома, не пазнаны ні жонкай, ні бацькамі, ні слугамі, прымаючы ад іх міласціну нароўні з іншымі жабракамі. Толькі пасля смерці Аляксея раскрываецца праўда пра яго пакутніцтва. Паводле аўтара, цела «чалавека Божага» не падлягала тленню. Той, хто дакранаўся да яго «дорогих костей», пазбаўляўся хвароб. У творы адлюстраваны ўзорны вобраз хрысціянскага святога, для якога свет Боскі вышэй за чалавечы. Ён напоўнены драматызмам і прапагандуе высокія маральныя якасці — любоў, духоўную моц, цярпенне, міласэрнасць. *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова